Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/05/2026 09:24:37

DOI:10.17951/sb.2021.15.155-171
Studia Białorutenistyczne 15/2021 LITERARY STUDIES
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Mikałaj Chaustowicz / Мікола Хаўстовіч

University of Warsaw (Poland)
e-mail: m.khaustovich@uw.edu.pl
https://orcid.org/0000-0002-3007-0603

# Праблемы атрыбуцыі вершаванага драматургічнага абразка *Atwieczerek*

*Problems of Attribution of the Poetic Dramatic Vignette* Atwieczerek

*Problemy atrybucji poetyckiego szkicu dramaturgicznego* Atwieczerek

**Abstract**

This article analyses the problem of attribution of the theatre vignette *Evening: An Occasion in a Tavern near Falkovičy* based on well-known and more obscure publications. The hypothesis about H. Marcinkievič being the author of this play originally belongs to R. Ziamkievič. Although he did not have concrete proof of said authorship (the section titles of the play were wrongly indicated), he was earnest in sharing his hypothesis, as he informed F. Aliachnovič and A. Šlubski. M. Pijatuchovič, on the other hand, had a different outlook on the authorship of *Evening*…. In all fairness, he does not address the question of authorship at all in the prologue to his planned publications of A. Rypinski's manuscripts, but it is likely that he mentioned during his lectures with Belarusian State University Students that the vignette was written by A. Viaryha-Dareŭski (we say this on the basis of later articles by A. Adamovič). M. Larčanka and L. Fihłoŭskaja, apparently lacking knowledge on A. Rypinski's manuscripts, found the vignette in „Leningrad archives and libraries," listed as written by Sazanovič. It is interesting that researchers have described the subject of the play in quite a general manner, as „the daily life of peasants under lordship," which corresponds with the illustration of the text in the manuscripts of A. Rypinski. After the publication of *Evening*… in 1988, most researchers (V. Rahojša, H. Kisialioŭ, U. Marchel) have positioned themselves in favour of H. Marcinkievič's authorship, even though V. Skałaban did propose not to rush to any final conclusions. The analysis of philological publications, the style of Polish-language works by H. Marcinkievič, as well as certain circumstances of literary life in Viciebsk between the end of the 1850s and the beginning of the 1860s allow us to voice some doubts about H. Marcinkievič being the actual author of *Evening: An Occasion in a Tavern near Falkovičyk*. An equally likely author could be either A. Viaryha-Dareŭski or Sazanovič.

**Keywords**: dramatic icon, A. Rypinski, *Evening*, H. Marcinkievič

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/05/2026 09:24:37



**Abstrakt**

Artykuł analizuje problem atrybucji obrazka dramatycznego *Adwiaczorak: Akazija u karczmie pad Falkowiczami* [Podwieczorek: Okazja w karczmie pod Falkowicami] na podstawie znanych i mało znanych publikacji. Hipotezę dotycząca H. Marcinkiewicza jako autora utworu wysnuł R. Ziamkiewicz. Nie miał dokładnych informacji (błędnie podał podtytuł sztuki), ale przekazał ją innym: poinformował F. Alachnowicza i A. Szlubskiego. M. Pijatuchowicz wyraził inny punkt widzenia na autorstwo *Adwiaczorka...* Jednak w przedmowie do planowanej publikacji rękopisów A. Rypinskiego nie poruszył kwestii autorstwa, choć w wykładach skierowanych do studentów Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego stwierdził, iż obrazek napisał A. Wiaryha-Dareuski (wiadomo na podstawie późniejszych artykułów A. Adamowicza). M. Łarczanka i L. Fihłouskaja, najwyraźniej nie wiedząc nic o rękopisach A. Rypinskiego, odkryli podczas kwerendy w archiwach/bibiotekach w ówczesnym Leningradzie sztukę *Adwiaczorak*… napisaną przez niejakiego Sazanowicza. Co ciekawe, badacze dość ogólnie scharakteryzowali temat utworu – „życie chłopów pańszczyźnianych”, co generalnie odpowiada tematowi tekstu z rękopisów A. Rypinskiego. Po publikacji w 1988 r. *Adwiaczorka…* większość badaczy (W. Rahojsza, H. Kisialou, U. Marchel) jednoznacznie opowiedzieli się za autorstwem H. Marcinkiewicza, chociaż W. Skałaban sugerował, aby nie spieszyć się z ostatecznymi wnioskami. Analiza literatury przedmiotu oraz niektóre okoliczności życia literackiego w Witebsku na przełomie lat 50. i 60. XIX w. świadczą, że jest bardzo wątpliwe, iż obrazek dramatyczny *Adwiaczorak: Akazija u karczmie pad Falkowiczami* napisany jest przez H. Marcinkiewicza. Tymczasem A. Wiaryhę-Dareuskiego lub niejakiego Sazanowicza nie można wykluczyć jako prawdopodobnego autora obrazka.

**Słowa kluczowe**: obrazek dramatyczny, A. Rypiński, *Adwiaczorak*, H. Marcinkiewicz

**Анатацыя**

У артыкуле на падставе вядомых і малавядомых публікацый разглядаецца праблема атрыбуцыі драматургічнага абразка *Адвячорак: Аказія ў карчме пад Фальковічамі*. Гіпотэза пра Г. Марцінкевіча як аўтара твора належыць Р. Зямкевічу. Дакладных звестак ён не меў (няправільна падаваў падзагаловак п’есы), але ўпэўнена пашыраў сваю гіпотэзу: паінфармаваў Ф. Аляхновіча і А. Шлюбскага. Адрозны пункт гледжання на аўтарства *Адвячорка*… меў М. Піятуховіч. Праўда, у прадмове да планаванае публікацыі рукапісаў А. Рыпінскага ён не закранаў пытання аўтарства, але, верагодна, на лекцыях для студэнтаў БДУ сцвярджаў, што абразок напісаў А. Вярыга-Дарэўскі (мяркуем на падставе пазнейшых артыкулаў А. Адамовіча). М. Ларчанка і Л. Фіглоўская, відаць, нічога не ведаючы пра рукапісы А. Рыпінскага, выявілі ў „ленінградскіх архівах і бібліятэках” п’есу *Адвячорак*…, якую напісаў нехта Сазановіч. Цікава тое, што даследнікі ахарактарызавалі тэму твора даволі агульна – „быт прыгоннага сялянства”, што ўвогуле адпавядае адлюстраванаму ў тэксце з рукапісаў А. Рыпінскага. Пасля публікацыі *Адвячорка*… ў 1988 г. большасць даследнікаў (В. Рагойша, Г. Кісялёў, У. Мархель) адназначна выказаліся на карысць аўтарства Г. Марцінкевіча, хоць В. Скалабан прапаноўваў не спяшацца з канчатковымі высновамі. Аналіз навуковае літаратуры, стылю польскамоўных твораў Г. Марцінкевіча, а таксама асобных акалічнасцяў віцебскага літаратурнага жыцця канца 1850 – пачатку 1860-х гг. дазваляе выказаць сумненні, што драматургічны абразок *Адвячорак: Аказія*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/05/2026 09:24:37



*ў карчме пад Фальковічамі* належыць пяру Г. Марцінкевіча. Не менш верагодным аўтарам можа лічыцца А. Вярыга-Дарэўскі ці нехта Сазановіч.

**Ключавыя словы:** драматургічны абразок, А. Рыпінскі, *Адвячорак*, Г. Марцінкевіч

Адзін з лепшых твораў сярэдзіны XIX ст. – вершаваны драматургічны абразок *Atwieczerek: Akazija u karczmie pad Falkowiczami* – упершыню быў апублікаваны Віталём Скалабанам у 1988 г. у хрэстаматыі *Беларуская літаратура XIX стагоддзя* (Marcìnkevìč, 1988, s. 74–92) паводле дадатку да артыкула Міхайлы Піятуховіча *Рукапісы А. Рыпінскага*, выяўленага ў паперах Васіля Мачульскага. Адзін са складальнікаў і аўтараў каментароў хрэстаматыі Вячаслаў Рагойша, спаслаўшыся на шэраг публікацый, даводзіў, што *Адвячорак* належыць пяру Гераніма Марцінкевіча:

> Лёс гэтай драматычнай паэмы доўгі час быў невядомы. Упершыню ўпамінанне пра яе з'явілася ў „Полымі" ў 1928 г. Паведамлялася, што рукапіс гэтага твора да Кастрычніцкай рэвалюцыі захоўваўся ў маёнтку Сялігоры на Лепельшчыне. Затым краязнаўца Д. Васілеўскі расшукаў звесткі пра пастаноўку драматычнай паэмы ў Віцебску ў 1861 г. („Наш край" 1929, № 5). Праўда, і ў першым, і ў другім выпадку назва твора падавалася скажона (*Аказія падпалкоўніцам*, *Аказія пад палкоўніцамі*). Толькі ў наш час літаратуразнаўцу В. Скалабану пашчасціла адшукаць машынапісную копію твора, знятую яшчэ да вайны М. Піятуховічам з рукапіснай копіі А. Рыпінскага. Копія (зараз яна захоўваецца ў Цэнтральным дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва БССР у Мінску) мае падзагаловак-растлумачэнне: *Адвячорак. Аказія ў карчме пад Фальковічамі напісана ў Віцебску ў 1858 г. перад Пілілаўкай*" (Lojka i Ragojša, 1988, s. 457).

Сам жа В. Скалабан, ажыццяўляючы ў 1990 г. навуковую публікацыю і артыкула М. Піятуховіча (паводле сучаснага правапісу), і „дадатку" (з захаваннем арфаграфічных асаблівасцяў арыгіналаў) (Pìâtuhovìč, 1990, s. 216), пра атрыбуцыю твора выказаўся больш асцярожна:

> Твор мае падзагаловак *Аказія ў карчме пад Фальковічамі*, што дазваляе выказаць меркаванне пра магчымага аўтара. Ёсць звесткі, што беларуская камедыя Гераніма Марцінкевіча *Аказія падпалкоўніцам* (другі варыянт назвы – *Аказія пры палкоўніцах*) была пастаўлена ў 1862 г. у Віцебску. Не выключана, што маецца на ўвазе якраз перапісаны А. Рыпінскім *Адвячорак*, а незразумелыя „палкоўніцы" і „падпалкоўніцы" паходзяць з „карчмы пад Фальковічамі". Але трэба нагадаць і дадзеныя, праўда, вельмі неакрэсленыя, прыведзеныя М. Ларчанкам і Л. Фіглоўскай у газеце „Літаратура і Мастацтва" (1939, № 13). Маладым на той час даследчыкам у ленінградскіх сховішчах пашчасціла выявіць невядомыя творы беларускай літаратуры XIX стагоддзя, у тым

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/05/2026 09:24:37



> ліку п’есу нейкага Сазановіча *Адвячорак*, дзе апісваўся побыт прыгоннага селяніна. Так што з канчатковымі вывадамі пра аўтарства *Адвячорка* спяшацца не выпадае (Skalaban, 1990, s. 216).

Аднак папярэджанне гісторыка і літаратуразнаўцы засталося па-за ўвагай навукоўцаў. Відаць, паўплывала некалькі фактараў. Па-першае, да беларускае літаратуры залічыў Г. Марцінкевіча Аляксандар Ельскі. Спачатку, у артыкуле *Пра беларускую гаворку* [„Co się teraz z kolei tyczy literatury białoruskiej, to, jakkolwiek nieobfita, posiada ona jednak utwory nieposlednie, np. dwóch Marcinkiewiczów[1], Korotyńskiego…” (Jelski, 1885, nr 6)], а пазней пацвердзіў, што меў на ўвазе не проста польскамоўнага паэта Беларусі, а менавіта беларускамоўнага ў *Вялікай усеагульнай ілюстраванай энцыклапедыі* „W latach 1840–1850 Marcinkiewicz Hieronim, wierszopis białoruski, pracował w Witebsku i wydawał swoje rzeczy drobne” (Jelski, 1892, t. 7–8, s. 650)]. Па-другое, даследнікі ведалі пра Г. Марцінкевіча як аўтара *Аказіі*… з розных крыніцаў [кароткая нататка ў сёмым нумары часопіса „Полымя” за 1928 г.; артыкул Данілы Васілеўскага *Поэма тарас на парнасе ў краязнаўчым асьвятленьні* ў пятым нумары часопіса „Наш край” за 1929 г., а таксама згадка Антона Семяновіча ў кнізе *Беларуская драматургія: Дакастрычніцкі перыяд* пра Г. Марцінкевіча, што ў 1862 г. паставіў у Віцебску беларускую камедыю *Аказія пры Палкоўніцах* (Semânovìč, 1961, s. 90–91)], якія, аднак, пацвярджалі адна другую.

Таму Г. Кісялёў у сваёй доктарскай дысертацыі аўтарытэтна сцвердзіў:

> У рукапісе Рыпінскага (і адпаведна ў машынапісе Піятуховіча) аўтар п’есы не называўся, п’еса мела падзагаловак: *Аказія ў карчме пад Фальковічамі* (тапонім рэальны – пад Віцебскам сапраўды ёсць такая вёска). Гэты падзагаловак і даў магчымасць атрыбуціраваць п’есу: было вядома, што віцебскаму літаратару Гераніму Марцінкевічу належала беларуская п’еса *Аказія падпалкоўніцам*, або *Аказія пры палкоўніцах*. Цяпер ёсць усе падставы думаць, што гэта ўсяго толькі перакручаны падзагаловак п’есы *Адвячорак* (гукавое супадзенне амаль поўнае)” (Kìsâlëŭ, 2003, s. 294).

Гіпотэзу Г. Кісялёва падтрымаў Уладзімір Мархель. На яго думку, *Адвячорак* прыйшоў да гледача ў 1861 г.: Арцём Вярыга-Дарэўскі арганізаваў у Віцебску пастаноўку драматургічнага абразка Г. Марцінкевіча на аматарскай сцэне (тут навуковец спасылаўся на публікацыі Д. Васілеўскага і А. Семяновіча); рукапіс *Адвячорка* яшчэ на пачатку ХХ ст. захоўваўся ў маёнтку Селігоры на Лепельшчыне (спасылка на нататку ў часопісе „Полымя”); а што датычыць неадпаведнасці гучання тытулаў камедыі Г. Марцінкевіча і твора з рукапісаў А. Рыпінскага, дык

1 Як адзначаў Г. Кісялёў, А. Ельскі паставіў Г. Марцінкевіча поруч з Вінцэнтам Дуніным-Марцінкевічам, відавочна, ведаючы беларускія творы першага (Kìsâlëŭ, 2003, s. 180, 342).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/05/2026 09:24:37



тут, хутчэй за ўсё, маецца на ўвазе „недакладна пачуты і перайначана ўзноўлены падзагаловак *Аказія ў карчме пад Фальковічамі*" (Marhel′, 1997, s. 86–87).

Сумненняў у правільнасці атрыбуцыі твора гісторыкі літаратуры, хіба, ужо не мелі, дык невыпадкова ён некалькі разоў перадрукоўваўся ў розных хрэстаматыях і анталогіях пад прозвішчам Г. Марцінкевіча (гл.: Cvìrka, 2000, s. 436–455; Kazberuk, 2001, s. 74–93; Cvìrka, Špakoŭskì, Antanovìč, 2013, s. 515–524; Kìsâlëva, Senkevìč, 2013, s. 482–503, 834).

На нашую думку, аднак, апошняя кропка ў справе атрыбуцыі вершаванага драматургічнага абразка *Адвячорак. Аказія ў карчме пад Фальковічамі* пастаўленая заўчасна. Даследнік, уважліва пазнаёміўшыся з матэрыяламі „справы", павінен адказаць на шэраг пытанняў, якія ўсё яшчэ застаюцца не высветленымі.

Першае, з чаго варта пачаць, дык задумацца: чаму А. Рыпінскі не ведаў, хто напісаў твор? А ён жа, вярнуўшыся ў жніўні 1859 г. на бацькаўшчыну, быў у блізкіх дачыненнях з А. Вярыгам-Дарэўскім, арганізатарам і лідарам літаратурнага і культурнага жыцця на Віцебшчыне ў тыя часы. Тым больш, што менавіта ён, А. Вярыга-Дарэўскі, нібыта арганізаваў пастаноўку камедыі на сцэне шляхецкага клубу. Атрымліваецца, што пра такую значную культурную падзею А. Рыпінскі не ведаў?

Мы маем таксама інфармацыю, што былы паўстанец і эмігрант з дзяцінства быў знаёмы з Г. Марцінкевічам: цягам трох навучальных гадоў (1825/1826, 1826/1827, 1827/1828) яны вучыліся ў адной установе – Віцебскай базыльянскай гімназіі (гл.: Hmâl′nìckaâ, 2016, s. 219–234). А гэта азначае, што напрыканцы 1850-х і пачатку 1860-х гг. яны не маглі не сустрэцца: не так шмат у Віцебску было літаратараў, аўтараў друкаваных зборнікаў паэзіі. Прыгадаем і тое, што А. Рыпінскі, маючы вялікую цікавасць да г. зв. народнай, ці *ludowej*, літаратуры не мінаў магчымасці, каб пазнаёміцца з ёю. Напрыклад, у цыдулцы да А. Вярыгі-Дарэўскага ён пісаў: „Іду, брат, па-твойму на мужыцкую свадзьбу аж у Бытрымова, так грошы табе после сам прывязу, а цяпер не маю часу. Гутаркі адсылаю, але после мне дасі" (Kìsâlёŭ, 2003, s. 274). „Сусед Рыпінскі" ўжо пазнаёміўся з нейкімі „гутаркамі", атрыманымі ад А. Вярыгі-Дарэўскага, адсылае, відаць, на просьбу ўладальніка, іх назад, але жадае зноў мець іх, магчыма, каб перапісаць. Зрэшты, перапісваннем фальклорных і літаратурных тэкстаў, а таксама напісаннем прадмоў да іх А. Рыпінскі займецца, хіба, крыху пазней (прадмова да *Bondara Sawascieja* датуецца 1865 г.). А ў той час ён не занатаваў твораў А. Вярыгі-Дарэўскага – іх няма ў г.зв. *Рукапісах А. Рыпінскага*. Дарэчы, хутчэй за ўсё „гутаркі" – гэта не творы Беларускае Дуды, а – маем смеласць дапусціць – беларускамоўныя гутаркі Паўстання, напрыклад, *Гутарка старога Дзеда* і інш. Праўда, мы павінны лічыцца і з тым, што „гутаркамі" можна было назваць у сярэдзіне XIX ст. фактычна любы беларускамоўны тэкст. А гэта азначае, што гаворка ў цыдулцы магла ісці амаль пра кожны (за выключэннем, вядома, балады *Нячысцік*) з пятнаццаці „хрэстаматыйных" твораў А. Рыпінскага.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/05/2026 09:24:37



Аднак мы не станем і выключаць таго, што А. Рыпінскі мог і не сустракацца з Г. Марцінкевічам, і нават нічога не ведаць пра яго. Шэраг фактаў можа пацвердзіць такое дапушчэнне. Па-першае, у *Альбоме* А. Вярыгі-Дарэўскага няма запісу Г. Марцінкевіча. Вядома, можна думаць, што адзін з двух запісаў (паводле нумарацыі Г. Кісялёва, 60 і 64) з неразборлівым почыркам належыць Г. Марцінкевічу, але ягоныя лісты да Адама Завадскага сведчаць, што падпісваўся ён дастаткова выразна, ды і запісы №№ 60 і 64 зроблены ў сакавіку 1862 г. і красавіку 1863 г., а – як мы памятаем – у 1862 г. (пасля 1 студзеня) Г. Марцінкевіч цяжка захварэў. Па-другое, А. Вярыга-Дарэўскі ў вядомых сёння допісах, паведамляючы пра культурнае жыццё ў Віцебску, у віленскія, варшаўскія і пецярбургскія выданні ніколі не згадаваў імя Г. Марцінкевіча. Сказанаму, не пярэчыць тое, што ў сёмым нумары газеты „Słowo" чытаем: „Маем таксама ў самім Віцебску некалькі асобаў, што пішуць, з якіх гэтым разам назавём Гераніма Марункевіча[2], вядомага сваімі зборнікамі вершаў і празаічнай кніжкай *Pisemka dorywcze*, якая адзначаецца высакароднымі і пачцівымі намерамі" (*Korespondencja „Słowa"*, 1859, nr 7). Параўноўваючы дасланы А. Вярыгам-Дарэўскім матэрыял і апублікаванае, мы мяркуем, што на падставе ліста Беларускае Дуды *Do Redaktora „Słowa"*(гл.: BCzart, sygn. 6977 IV; Haŭstovìč, 2014, s. 207–213) рэдакцыя падрыхтавала артыкул, папраўляючы і дадаючы тое, што лічыла патрэбным. Нашая ранейшая думка пра перапрацоўку матэрыялу самім аўтарам памылковая: праўкі і выкрэсліванні чырвоным і сінім алоўкамі гавораць пра тое, як рэдакцыя „Słowa" рыхтавала матэрыял А. Вярыгі-Дарэўскага да публікацыі; апрача таго, мы памятаем, як у першым лісце да Эдварда Жалігоўскага віцебскі літаратар пагаджаўся на рэдактарскую праўку: „Ведаю, што ў гэтай справе не стрымаюць Цябе аніякія прыхільнасці: давай парады, крэслі, кідай у печ – усё гэта будзе для мяне дарагім, братэрскім і жыццядайным" (гл.: BCzart, sygn. 6976 IV; Haŭstovìč, 2014, s. 214), а ў студзеньскім лісце Беларускае Дуды няма аніякіх згадак пра раней дасланы матэрыял.

Гіпатэтычна можам прапанаваць: даўнейшай сяброўскай прыхільнасці Г. Марцінкевіча і А. Вярыгі-Дарэўскага нешта зашкодзіла. Але – што? Вядома, калі дапусціць, што віцебскі патрыятычны лагер прачытаў *Адвячорак* так, як зрабіў (і слушна – заўважым) Г. Кісялёў[3], то ён мог адвярнуцца ад літаратара за абарону прыгонніцтва. Такое прачытанне магло быць ухваленае толькі прадстаўнікамі лагера буйных землеўласнікаў, а значыць невыразныя чуткі пра пастаноўку п'есы на сцэне дваранскага клубу маглі мець пад сабою пэўнае абгрунтаванне. Аднак справа ў тым, што падобную пастаноўку не маглі прапусціць „Витебскія губернскія вѣдомости" і фактычны рэдактар ейнае неафіцыйнае часткі

[2] Няправільна пададзенае прозвішча – памылка друку.

[3] „У п'есе *Адвячорак* (1858) Г. Марцінкевіча цытуецца і крытычна ацэньваецца, асуджаецца за радыкалізм вядомы ананімны верш *Вясна гола перапала*, напоўнены чаканнем свабоды" (Kìsâlëŭ, 2007, s. 484).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/05/2026 09:24:37



Ксенафонт Гаворскі, якія ў той час, змагаючыся з польскаю партыяй, па словах даследніцы Святланы Сарокі, нават зрабілі спробу „официальной легализации белорусского языка" (Saroka, 2001a, s. 11). Але газета, здаецца, „не заўважыла" *Адвячорак* на сцэне дваранскага клубу[4]. Дык ці была пастаноўка ўвогуле? Ці мог прапусціць такую падзею А. Рыпінскі? Бо калі б ён ведаў пра гэтую пастаноўку, то, перапісваючы ў 1877 г. драматургічны абразок свайго калегі па гімназіі, абавязкова гэта адзначыў бы ў прадмове.

Мяркуем, што інфармацыя пра Г. Марцінкевіча як аўтара камедыі *Аказія пры Палкоўніцах* (падзагаловак падаваўся па-рознаму), а таксама пра пастаноўку ў 1861 ці 1862 г. твора на віцебскай сцэне паходзіць ад Рамуальда Зямкевіча. Ён, праўда, нідзе ў сваіх публікацыях не згадваў пра беларускія творы Г. Марцінкевіча, але тыя, хто атрымаў ад яго інфармацыю, добрасумленна спасылаліся на славутага бібліямана.

У першай палове XX ст. Р. Зямкевіч быў, між іншым, адным з найбольш дасведчаных гісторыкаў беларускае літаратуры. З маладых гадоў рознымі праўдамі і няпраўдамі – купляючы, выпрошваючы, пазычаючы і крадучы кнігі і рукапісы – ён здолеў сабраць аграмадны кнігазбор[5]. Нарадзіўся Р. Зямкевіч у Варшаве, меў у доме пры вуліцы Хмельнай, 68 двухпакаёвую кватэру, але значную частку свайго жыцця правёў на Беларусі: у Вільні, дзе нейкі час працаваў у рэдакцыі „Нашай Нівы", на Міншчыне (у тым ліку – у Крашыне), Віцебшчыне і Магілёўшчыне. Да яго няраз звярталіся па дапамогу навукоўцы, якія даследавалі беларускую мову, літаратуру і фальклор – Яўхім Карскі, Міхал Федароўскі, а таксама дзеячы беларускага адраджэння дасавецкага і савецкага перыяду. І – трэба заўважыць – Р. Зямкевіч шчодра дзяліўся інфармацыяй, хоць, здаецца, рэдка калі перадаваў кніжкі ці рукапісы са сваіх збораў. Сам жа ён публікаваўся не так і часта. Ягоныя зборы, неапісаныя[6], некласіфікаваныя і па-сапраўднаму незапатрабаваныя, у пераважнай сваёй бальшыні загінулі. А таму немагчыма высветліць, на падставе чаго Р. Зямкевіч інфармаваў сваіх знаёмых пра камедыю Г. Марцінкевіча *Аказія пры Палкоўніцах*. Магчыма, гэта былі

4 Так, прынамсі, вынікае з публікацый С. Сарокі (Saroka, 2001b, s. 188–198; Saroka, 2001c, s. 123–130; Saroka, 2001d, s. 192–202), а таксама ейнага прыватнага паведамлення.

5 Няраз пра кнігазбор Р. Зямкевіча пісаў Юльян Кшыжаноўскі (гл.: Krzyżanowski, 1970, t. I, s. 143–161; Krzyżanowski, 1997, s. 373–376).

6 Здаецца, толькі Эдвард Хвалявік коратка ахарактарызаваў збор Р. Зямкевіча: „Гуманістычная бібліятэка на розных мовах з асаблівым улікам гісторыі, літаратуры, мовазнаўства і фальклору Літвы, Беларусі, Украіны, а таксама Славяншчыны ўвогуле. Збор друкаў (*Біблія* Скарыны, *Астрожская Біблія*, *Слоўнік Памвы Берынды* і ш[мат] ін[шых], нават навуковых бібліяграфій) і беларускіх часопісаў. Беларускія рукапісы Аляксандра Рыпінскага, Арцёма Вярыгі-Дарэўскага, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Яна Неслухоўскага, Францішка Багушэвіча, Антона Лявіцкага (псеўданім: Ядвігін Ш.) Максіма Багдановіча і ін[шых]" (Chwalewik, 1927, s. 440).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/05/2026 09:24:37



вусныя паведамленні беларускіх калекцыянераў і бібліяфілаў; хутчэй за ўсё – Віцэнта Мяніцкага.

Першым, з кім Р. Зямкевіч падзяліўся звесткамі пра Г. Марцінкевіча і ягоны драматургічны абразок, быў, відаць, Францішак Аляхновіч, які на пачатку 1920-х гг. рыхтаваў працу пра беларускі тэатр:

> Але ня толькі Марцінкевіч пісаў у палове мінулага сталецьця беларускія п’есы. Арцём Вярыга-Дарэўскі (памёр у 1884 г. ў Іркуцку ў ссылцы) напісаў драму *Гордасьць*, камэдыю *Гнеў* і камэдыю-опэру *Грэх*. Творы яго былі ў 1863 годзе сканфіскаваны ў Віцябску[7]. Геранім Марцінкевіч напісаў камэдыю *Аказія пры Палкоўніцах*, якая ставілася ў Віцябску ў 1862 г. Адрыўкі гэтай камэдыі меў п. Вінцэнт Мяніцкі ў Віцябску[8] (Alâhnovìč, 1924, s. 83–84).

Кніжку Ф. Аляхновіча ведаў і выкарыстаў у сваім даследаванні А. Семяновіч, але з тае прычыны, што ў 1960-я гг. імя аўтара *У кіпцюрох ГПУ* было пад забаронаю, ён не палічыў магчымым называць крыніцу інфармацыі (Semânovìč, 1961, s. 90–91). З гэтага часу ў працах беларускіх даследнікаў са спасылкамі на А. Семяновіча, а таксама і без спасылак згадваецца 1862 г. як год пастаноўкі камедыі ў Віцебску (Mal′dzìs, 1962, № 12).

Зрэшты, інфармацыя пра гэтую падзею магла трапіць у навуковы дыскурс і з ананімнае нататкі ў часопісе „Полымя”: „У маёнтку Селізоры, Лепельскага раёну, у дарэволюцыйныя часы знаходзілася вялікая бібліотэка, у якой было шмат рэчаў з беларускай культуры. Паміж іншым, тут знаходзілася драма *Аказія подпалкоўніцам* Гароніма Марцінкевіча (брат Вінцука Марцінкевіча), якая ў 1862 г. ставілася на Віцебскай сцэне. Лепельскае краязнаўчае т-ва зараз вядзе адшуканне гэтага твору” (*Hronìka belaruskae kul'tury*, 1928, № 7, s. 218). Надзвычай цікавым было б высветліць: ці не ўзнікла дадзенае паведамленне на падставе кніжкі Ф. Аляхновіча? На нашую думку, мажлівасць гэтага дастаткова высокая: пераехаўшы ўвосень 1926 г. у Савецкую Беларусь, Ф. Аляхновіч некалькі месяцаў жыў у Менску, а таксама – што істотна – наведваўся ў Віцебск, увесь час кантактуючы з тэатральным асяроддзем. Ён мог камусьці падараваць сваю кніжку *Беларускі тэатр*, мог у размове паведаміць пра незвычайны факт – пастаноўку беларускамоўнага драматургічнага твора ў XIX стагоддзі.

Аўтарам „палымянскае” нататкі з’яўлялася, магчыма, асоба з віцебскага тэатральнага асяроддзя ці краязнаўчых колаў. Асоба, якая ведала, што В. Мяніцкі валодаў маёнткам Селігоры (у „Полымі” – памылка друку), ведала, што лепельскія краязнаўцы зацікавіліся беларускамоўным рукапісам, а дапушчэнне, што Г. Марцінкевіч – гэта „брат Вінцука Марцінкевіча”, сведчыць не столькі пра

[7] Тут Ф. Аляхновіч у зносцы пазначыў: „Паводле данных п. Р. Земкевіча”.
[8] Тут падобная пазнака: „Таксама паводле Р. Земкевіча”.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/05/2026 09:24:37



неабазнанасць аўтара, колькі пра агульны стан беларускага літаратуразнаўства[9]. Арышт і высылка Ф. Аляхновіча сталі прычынай, што ў „Полымі" не магло згадвацца ягонае імя. Нават, калі ў аўтарскім допісе ў часопіс яно і было.

Зрэшты, насцярожвае тое, што ў публікацыях па-рознаму падаецца загаловак твора. Якім чынам *Аказія пры Палкоўніцах* перамянілася ў *Аказію подпалкоўніцам*? Чаму тапонім стаўся апелятывам[10]? Не выклікае сумнення, што і ў Р. Зямкевіча, і ў Ф. Аляхновіча гаворка ішла пра пэўны населены пункт, у якім здарылася „аказія". Але які?

*Геаграфічны слоўнік* ведае толькі[11] дзве вёскі Палкаўніча (Połkownicza) на Умані і ў Тарашчанскім павеце Кіеўскае губерні[12]. Няўжо „аказія" – гэта падзеі (уманьская разня) стагадовае даўніны на Украіне? Але нават тое, што сяляне вёскі Палкоўніча разам з гайдамакамі актыўна ўдзельнічалі ў захопе летам 1768 г. Умані (Skal′kovskìj, 1845, s. 89), не можа сведчыць пра напісанне беларускім аўтарам, а пасля і пастаноўку камедыі пра даўнія часы на віцебскай сцэне. Назва мясцовасці, відавочна, была „недакладна пачутая і перайначаная".

Перайначыў яе і Даніла Васілеўскі, калі ў 1929 г., карыстаючыся лістамі Р. Зямкевіча да Аляксандра Шлюбскага, пісаў артыкул, у якім імкнуўся давесці, што з віцебскіх паэтаў толькі А. Вярыга-Дарэўскі мог напісаць *Тараса на Парнасе*:

> Калі перабраць па адным усіх пісьменнікаў і паэтаў, якія пісалі беларускія вершы і жылі ў Віцебску каля 60 гадоў XIX стагодзьдзя, то ўвага даследчыка спыняецца на 2 асобах: Арцеме Дарэўскім-Вярызе і Гераніме Марцынкевічу. Г. Марцынкевіч пісаў вершы на польскай мове, але прабаваў свае сілы і ў беларускай камэдыі. У 1861 г. яго камэдыя *Аказія пад Палкаўніцамі* была пастаўлена на сцэне дваранскага клюбу Віцебску. Ставіў камэдыю гурток аматараў пад кіраўніцтвам другога вядомага тады пісьменьніка Арцёма Вярыгі[13]. Да нас дайшло некалькі зборнікаў польскіх вершаў Г. Марцынкевіча, польская мова яму была зручней беларускай. Геранім Францавіч Марцынкевіч служыў памоцнікам начальніка стала ў Віцебскім Губэрнскім дэпутацкім сабраньні, па роду

---

9 Дарэчы будзе заўважыць, што ні Я. Карскі, ні М. Гарэцкі не згадвалі ў сваіх працах пра беларускія творы Г. Марцінкевіча, хоць, безумоўна, ведалі публікацыі А. Ельскага.

10 Маем на ўвазе тэрмін, які абазначае групу асобаў паводле прафесійнае прыналежнасці.

11 На тэрыторыі Беларусі мы выявілі: Палковічы (Połkowicze) – вёска ў Бабруйскім павеце і два маёнткі ў Полацкім павеце, а таксама вёску Палкаўшчызна (Połkowszczyzna) у Дзісенскім павеце.

12 „Палкоўніча 1. в[ёска] ля рэчкі Манькоўка, пр[ыток] Тыкіча, Уманьскі пав[ет], адасобленая рэчкаю ад мяст[эчка] Іванька, 861 жых[ар] аб[одвух] пол[аў] і 2375 дзес[яцінаў] зямлі; драўляная Траецкая царква мае 38 дзес[яцінаў] зямлі. Належыць да Іваньскага ключа кн[язёў] Любамірскіх. 2. П., в[ёска] ля балота Цэцылія, Тарашчанскага пав[ета], за 5 в[ёрстаў] ад Янішоўкі (правасл[аўная] пар[афія]) на адлегласці 3 в[ёрст] ад Янішоўкі, 207 жых[кароў] аб[обвух] пол[аў]. Належыць да Ставішчанскага ключа гр[афаў] Браніцкіх. Ю[заф] Кш[ывіцкі]" (*Słownik geograficzny…,* 1887, t. VIII, s. 713).

13 У гэтым месцы Д. Васілеўскі пазначыў: „З лісту б. Зямкевіча – А. Шлюбскаму ад 25/VII 1927 г.".

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/05/2026 09:24:37



> сваёй службы не сустракаўся з сялянамі, дзеля чаго прыходзіцца адкінуць думку аб яго аўтарстве (Vasìleŭskì, 1929, № 5, s. 24).

Праўда, перайначванне Д. Васілеўскага можа быць сведчаннем, што Р. Зямкевіч падаў Ф. Аляхновічу адзін тытул „камедыі", а А. Шлюбскаму – крыху іншы. *Аказія пры Палкоўніцах* перамянілася ў *Аказію пад Палкаўніцамі*. Хоць – хутчэй – гэта Д. Васілеўскі польскі прыназоўнік ***przy*** замяніў на беларускі ***пад***. Аднак і гэтае дапушчэнне не з'яўляецца вырашэннем праблемы: у „палымянскай" нататцы мы бачым таксама беларускі прыназоўнік ***под***/***пад***.

На жаль, Д. Васілеўскі ў сваёй публікацыі нічога не кажа, ні пра Селігоры, ні пра В. Мяніцкага, а 1861 г., пададзены ім як год пастаноўкі твора (у Ф. Аляхновіча і ў „Полымі" – 1862 г.)[14], канчаткова заблытвае справу, якую без новых матэрыялаў немагчыма зразумець адназначна.

Наступнае пытанне, на якое варта пашукаць адказу, звязанае з працаю М. Піятуховіча па падрыхтоўцы рукапісаў А. Рыпінскага да друку. А менавіта: чаму прафесар БДУ не звярнуў увагі на тры публікацыі пра Г. Марцінкевіча і ягоную камедыю, загаловак якое мае гукавое падабенства з „найбольш цікавым з усіх твораў, якія змешчаны ў рукапісах Рыпінскага" (Pìâtuhovìč, 1990, s. 232) – *Akazijaj u karczmie pad Falkowiczami*? Прынамсі, „Полымя" і „Наш Край" ён павінен быў чытаць. У такім выпадку, для М. Піятуховіча ці то гукавое супадзенне не было відавочным, ці то ён не пагаджаўся на аўтарства Г. Марцінкевіча. Характэрна, што аніякіх каментароў адносна атрыбуцыі выяўленага ім твора навуковец не зрабіў, але, магчыма, у сваіх лекцыях аўтарам *Адвячорка* называў А. Вярыгу-Дарэўскага. Прынамсі, Антон Адамовіч у сваіх пазнейшых публікацыях як нешта даведзенае і агульнапрынятае пісаў:

> Аўтарства твору [*Вясна гола перапала*] прыпісвалася часта (як часам і аўтарства *Тараса на Парнасе*), але зусім беспадстаўна, В. Дуніну-Марцінкевічу (і якасьць вершу і сацыяльная завойстранасьць сьветчыць катэгарычна супраць гэтага). У ўспамінаных рукапісах Рыпінскага аўтарам падаецца нейкі, прозьвішчам не названы, мешчанін, выведзены разам з гэтым сваім вершам у перапісаным у тых-жа рукапісах сцэнічным абразку А. Вэрыгі-Дарэўскага *Адвячорак*[15]. *Датай напісаньня найчасьцей падаецца 1860 г. (у кажным разе, зусім ясна, што твор напісаны дзесь зусім блізка да мамэнту г. зв. «вызваленьня сялян ад прыгону»). Першы радок у рукапісных сьпісках часта мае цяжкі для зразуменьня выгляд Вясна голад перапала*; мы прынялі тут зусім ясную рэдакцыю выданьня 1900 г. – *Вясна гола перапала* (Adamovìč, 1956, № 25−26, s. 6).

[14] Мяркуем, што калі сапраўды на сцэне шляхецкага клубу ставілася камедыя, дык гэта магло адбыцца – хутчэй за ўсё – на пачатку 1862 г. падчас чарговых шляхецкіх выбараў.

[15] Не спасылаючыся на А. Адамовіча (у сярэдзіне 1980-х гг. зрабіць гэта ў друку было немагчыма), А. Мальдзіс пераказаў гэты фрагмент артыкула эміграцыйнага літаратуразнаўца (Malʹdzìs, 1987, s. 123–124).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/05/2026 09:24:37



Крыху пазней ён паўтарыў тое самае:

> Ня менш цікавыя былі й *Два д'яблы* таго-ж аўтара, але іх удалося адно перагартаць, прычым кінулася ў вочы, што адзін з «д'яблаў» мае рэплікі парасейску, а другі – папольску, уся-ж рэч пабеларуску й крышку большая за *Тараса*. Яшчэ, гартаючы, успала на вока, што ў п'есу Вэрыгі-Дарэўскага ўваходзіць ведамы верш *Вясна, голад, перапала*, зь якім выступае нейкі «Магілеўскі мешчанін»… Пра рукапісы Рыпінскага мусілі-б памятаць іншыя тагачасныя студэнты праф. Пятуховіча, зь якіх у сучасным савецкім друку спатыкаюцца, прыкладам, прозьвішчы Пятра Глебкі, цяпер ужо аж акадэміка, моваведаў Кастуся Гурскага й Лявона Шакуна, бібліяграфа Ніны Ватацы (у вапошняй, як у вельмі акуратнай студэнткі свайго часу, можа й захаваліся запісы лекцыяў праф. Пятуховіча?) Калі толькі праф. Пятуховіч увесь час захоўваў гэтыя рукапісы ў сябе, яны маглі-б трапіць пры ягоным арышце ў рукі НКВД, добра было-б, каб савецкія беларускія дасьледнікі спрамагліся як-небудзь пашукаць у гэных архівах…" (Adamovič, 1963, kn. 2, s. 90).

Рукапісы А. Рыпінскага М. Піятуховіч набыў у 1929 г., а ўжо 21 кастрычніка г.г. кафедра гісторыі беларускае літаратуры Беларускай акадэміі навук зацвердзіла да друку ягоны артыкул *Творчасць Рыпінскага* (Kìsâlëŭ, 2005, s. 436). Трэба думаць, артыкул быў падрыхтаваны аўтарам і планаваўся ў наступны том „Запісак Аддзелу гуманітарных навук: Працы клясы філёлёгіі" на 1930 г. Аднак трэці том „Працаў…", як вядома, не выйшаў і не захавалася звестак пра тое, ці рабіў М. Піятуховіч спробы надрукаваць сваю працу ў нейкім іншым выданні, ці знаёміў калегаў з новымі, невядомымі раней творамі беларускае літаратуры XIX ст. Знаходзім адно цьмяную згадку Г. Кісялёва, які, спасылаючыся на нататкі Антона Адамовіча[16], паведамляе, што Васіль Мачульскі „аперыраваў падобнымі дадзенымі (пра Канстанціна Вераніцына як аўтара *Тараса на Парнасе*. – М. Х.) ў сваім дакладзе ў акадэміі ў 1930 г." (Kìsâlëŭ, 2005, s. 481).

Міхась Ларчанка, стаўшы ў 1932 г. аспірантам Інстытута літаратуры БАН і маючы мажлівасць да сярэдзіны 30-х гг. сустракацца і з М. Піятуховічам, і з В. Мачульскім, нічога, хіба, не ведаў пра рукапісы А. Рыпінскага. Пра гэта сведчыць ягоны (разам з Любоўю Фіглоўскаю) артыкул[17] у газеце „ЛіМ":

> У ленінградскіх архівах і бібліятэках мы змаглі выявіць некаторыя невядомыя арыгінальныя матэрыялы па беларускай літаратуры, якія маюць для нас навуковае і палітычнае значэнне. Разам з тым знойдзен цэлы рад поўвядомых старынных твораў, аб якіх у Беларусі мала хто ведаў, хоць яны

[16] Цяжка сказаць, што Г. Кісялёў называў „нататкамі Антона Адамовіча", але ў публікацыях эміграцыйнага літаратуразнаўцы мы падобнае інфармацыі не выявілі.

[17] Значныя фрагменты артыкула (без „радкоў агітацыйна-палітычных") перадрукаваныя ў часопісе „Калосьсе" (1939, № 3, с. 168–171.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/05/2026 09:24:37



> і былі надрукаваны. Сярод знойдзеных матэрыялаў асаблівую цікавасць прадстаўляюць арыгінальныя, яшчэ нідзе не надрукаваныя рукапісы мастацкіх твораў на беларускай мове: 1) *Панская ласка* – ананімная паэма аб прыгонніцкім ладзе, у якой даецца рэзкая крытыка паноў-прыгоннікаў; 2) *Воскресение христово и сошествие его в ад* – ананімны парадыйны твор, які нагадвае сабою беларускую паэму *Тарас на Парнасе*. Калі ў паэме *Тарас на Парнасе* парадыруюцца грэчаская і рымская міфалогія і дваранскія густы, дык у гэтым творы рэзка высмейваецца біблія, крытыкуецца рэлігія; 3) *Сцяпан і Тацяна* – бытавая паэма аб жыцці беларускага сялянства, напісаная селянінам Марозам[18]. Гэта паэма надрукавана была ў газеце „Минский листок" за подпісам Шункевіча. На самай справе, як цяпер відаць з рукапісу, гэту паэму напісаў не Шункевіч, а селянін Менскай губерніі. Наступны рукапісны твор – п'еса *Адвячорак*, напісаная Сазановічам, паказвае быт прыгоннага сялянства" (Larčanka i Figloŭskaâ, 1939, № 13).

На жаль, ні М. Ларчанка, ні Л. Фіглоўская ніколі ў сваіх публікацыях не згадвалі *Адвячорак* Сазановіча. Аднак, мяркуючы па тым, што і *Панская ласка*, і *Воскресение христово и сошествие его в ад* былі надрукаваныя (гл.: Kupala, 1940, s. 114–124; Pšyrkoŭ, 1950, s. 23–32), трэба думаць, што і п'есу *Адвячорак* даследнікі перапісалі, а, мажліва, як гэта было ў выпадку з *Панскай ласкаю*, зрабілі фотакопію[19]. Праўда, сярод захаваных матэрыялаў архіва М. Ларчанкі п'есы Сазановіча *Адвячорак* няма (BDAMLiM, f. 461, vop. 1, adz. zah. 202). Магчыма, яна была страчаная падчас Другое сусветнае вайны. Невыпадкова, відаць, у выданні *Зборніка тэкстаў* 1950 г. не згадваецца „Вучоны Архіў Геаграфічнага Таварыства ў Ленінградзе".

Цікава, аднак, тое, што змяшчаючы ў выданні *Зборніка тэкстаў* 1940 г. верш *Вясна, голад, перапала* паводле зборніка *Ščeroŭskije dažynki. Kupałła: Apowieści*

[18] На нашую думку, менавіта гэтая інфармацыя сталася падставаю для прыпісвання паэмы *Сцяпан і Тацяна* Мікалаю Марозіку. (гл.: Mal′dzis, 1969, s. 165–166; Barysenka, 1968, t. 2, s. 81–82 і інш.). Аднак даследнікі цалкам забыліся звярнуць увагу на рознае версіфікацыйнае майстэрства аўтара гэтага твора і вядомых тэкстаў М. Марозіка. І – самае істотнае – аўтар *Сцяпана і Тацяны* пісаў у каментары да публікацыі: „Это нарѣчіе, на которомъ написано стихотвореніе, свойственно преимущественно бѣлорусамъ Минскаго уѣзда" (Šunkevič″, 1889, № 18). Лаўрышава, дзе жыў М. Марозік, ніколі не ўваходзіла ў склад Мінскага павета.

[19] У *Зборніках тэкстаў* 1940 і 1950 гг. маецца фотакопія (факсіміле ці нешта іншае – тэхніку выканання вызначыць складана) першае старонкі паэмы (у жанравых адносінах – гэта, хутчэй, гутарка) *Панская ласка* з рукапісу Пратаса Альхімовіча *Сборникъ бѣлорусскихъ народныхъ легендъ, былинъ и пѣсенъ, съ описаніемъ нѣкоторыхъ обрядовъ, обычаевъ, праздниковъ и игрищъ крестьянъ Себежскаго уѣзда. 284 стр. въ четверку и препроводительное письмо въ Общ. отъ 12 дек. 1892 г. Рукопис 1882–1890 г.* Паводле апісання Дзмітрыя Зяленіна (Zelenin″, 1914, s. 134–140), у гэтым зборніку, апрача згаданых вышэй двух вершаваных твораў была яшчэ ананімная паэма *Чортава сіла*, упершыню апублікаваная ў 2019 г. (гл.: Расûра, 2019, № 5 (102), s. 219–227).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/05/2026 09:24:37



*Wincuka Marcinkiewicz* (wydańnie druhoje, Pieciarburh 1910)[20], складальнікі пазначаюць у прадмоўцы: „Аўтар гэтага верша невядомы. Некаторымі даследчыкамі гэты верш адносіцца да 1860 г. і прыпісваецца Дуніну-Марцынкевічу. Акадэмік Карскі аб гэтым вершы гаворыць: «Нельга скрыць той акалічнасці, што змест гэтага верша не гарманіруе з агульным тонам паэзіі Дуніна-Марцынкевіча, ды і склад верша нібыта другі»" (Kupala, 1940, s. 113). Няўжо, маючы ў руках *Адвячорак*, дзе ёсць і тэкста верша, і атрыбутыўныя падказкі („Нехта вумный галава // У Магілеве жывець", „Магілёўскі ён кулажнік"), складальнікі не маглі выкарыстаць новыя звесткі?

Ці ўсё ж *Адвячорак* Сазановіча – гэта не *Atwieczerek: Akazija u karczmie pad Falkowiczami* з рукапісаў А. Рыпінскага, а нешта іншае?

Аналіз даступнае на сённяшні дзень літаратуры, а таксама асобных акалічнасцяў літаратурнага жыцця на Віцебшчыне дазваляе зрабіць наступныя высновы: 1. Вельмі сумнеўна, што вершаваны драматургічны абразок *Atwieczerek: Akazija u karczmie pad Falkowiczami* напісаў Г. Марцінкевіч. Не менш верагодным аўтарам твора можа лічыцца А. Вярыга-Дарэўскі. 2. Нельга выключаць, што напрыканцы 1850-х – пачатку 1860-х гг. у Віцебску была напісаная камедыя *Аказія пад Палкаўніцамі.* 3. Маюцца падставы не атаясамліваць *Адвячорак* Сазановіча з драматургічным абразком *Atwieczerek: Akazija u karczmie pad Falkowiczami*.

## REFERENCES / BIBLIOGRAFIA

Adamovìč, Anton. (1956). Na nìvah ì ŭzvyššah belaruskaga slova: Ì. Na padyhodah da našanìŭstva. Ananìmnaâ spadčyna sârèdzìny XIX v. *Vâsna gola perapala*. *Bac'kaŭščyna*, 25−26 (24 čèrv.). [Адамовіч, Антон. (1956). На нівах і ўзвышшах беларускага слова: І. На падыходах да нашаніўства. Ананімная спадчына сярэдзіны XIX в. *Вясна гола перапала*. *Бацькаўшчына*, 25−26 (24 чэрв.)].

Adamovìč, Anton. (1963). Da pabudovy navukovae gìstoryì belaruskae lìtaratury. *Zapìsy: Belaruskì Ìnstytut Navukì j Mastactva*, 2. [Адамовіч, Антон. (1963). Да пабудовы навуковае гісторыі беларускае літаратуры. *Запісы: Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва*, 2].

Alâhnovìč, Francìšak. (1924). *Belaruskì tèatr*. Vìl′nâ: Vydan′ne Belaruskaga Gramadzânskaga Sabran′nâ. [Аляхновіч, Францішак. (1924). *Беларускі тэатр*. Вільня: Выданьне Беларускага Грамадзянскага Сабраньня].

Barysenka, Vasìl′ (red.). (1968). *Gìstoryâ belaruskaj dakastryčnìckaj lìtaratury ŭ dvuh tamah*. T. 2. Mìnsk: Navuka ì tèhnìka. [Барысенка, Васіль (рэд.). (1968). *Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры ў двух тамах*. Т. 2. Мінск: Навука і тэхніка].

[20] Больш дакладна: верш *Wiesna hoład pierepeła…* падаецца ў прадмове Вацюка Тройцы (Вацлава Іваноўскага) *Wincuk Dunin-Marcinkiewicz i jaho žyćcio*. В. Іваноўскі, датуе верш 1860 годам.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/05/2026 09:24:37



Biblioteka XX Czartoryskich w Krakowie, sygn. 6977 IV; 6976 IV.

BDAMLìM, f. 461, vop. 1, adz. zah. 202 [БДАМЛіМ, ф. 461, воп. 1, адз. зах. 202].

Chwalewik, Edward. (1927). *Zbiory polskie: Archiwa, Bibljoteki, Galerie, Muzea i inne zbiory pamiątek przeszłości w ojczyźnie i na obczyźnie*. T. 2. Warszawa–Kraków: Jakub Mortkowicz.

Chlebowski, Bronisław; Sulimierski, Filip; Walewski, Władysław (red.). (1887). *Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich*. T. 8. Warszawa: Nakładem Filipa Sulimierskiego i Władysława Walewskiego.

Cvìrka, Kastus′. (2000). *Lìtaratura Belarusì: Peršaâ palova XIX stagoddzâ*: Hrèstamatyâ. Mìnsk: Belaruskaâ navuka. [Цвірка, Кастусь. (2000). *Літаратура Беларусі: Першая палова XIX стагоддзя: Хрэстаматыя*. Мінск: Беларуская навука].

Cvìrka, Kastus′; Špakoŭskì, Ìvan; Antanovìč, Kanstancìn (ukl.). (2013). *Lìtaratura Belarusì XIX stagoddzâ: Antalogìâ*. Mìnsk: Belaruskaâ navuka. [Цвірка, Кастусь; Шпакоўскі, Іван; Антановіч, Канстанцін (укл.). (2013). *Літаратура Беларусі XIX стагоддзя: Анталогія*. Мінск: Беларуская навука].

Haŭstovìč, Mìkola. (2014). *Dasledavannì ì matèryâly: Lìtaratura Belarusì XVIII–XIX stagoddzâŭ*. T. 1. Warszawa: Katedra Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego. [Хаўстовіч, Мікола. (2014). *Даследаванні і матэрыялы: Літаратура Беларусі XVIII–XIX стагоддзяў*. T. 1. Warszawa: Katedra Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego].

Hmâl′nìckaâ, Lûdmìla. (2016). Vìcebskaâ bazyl′ânskaâ gìmnazìâ ŭ 1822–1832 gadah. *Acta Albaruthenica*, 16, s. 219–234. [Хмяльніцкая, Людміла. (2016). Віцебская базыльянская гімназія ў 1822–1832 гадах. *Acta Albaruthenica*, 16, с. 219–234.].

Hronìka belaruskae kul′tury: Roznae. (1928). *Polymâ*, 7. [Хроніка беларускае культуры: Рознае. (1928). *Полымя*, 7].

Kazberuk, Uladzìmìr. (2001). *Zanâpad ì adradžènne: Belaruskaâ lìtaratura XIX stagoddzâ*. Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura. [Казберук, Уладзімір. (2001). *Занядад і адраджэнне: Беларуская літаратура XIX стагоддзя*. Мінск: Мастацкая літаратура].

Kìsâlëva, Lìâ; Senkevìč, Nìna (ukl.). (2013). *Zalataâ kalekcyâ belaruskaj lìtaratury ŭ 50 tamah*. T. 4. *Lìtaratura drugoj palovy XIX stagoddzâ*. Cz. 1. Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura. [Кісялёва, Лія; Сенкевіч, Ніна (укл.). (2013). *Залатая калекцыя беларускай літаратуры ў 50 тамах*. T. 4. *Літаратура другой паловы XIX стагоддзя*. Ч. 1. Мінск: Мастацкая літаратура].

Kìsâlëŭ, Genadz′ (ukl.). (2003). *Pačynal′nìkì: Zgìstoryka-lìtaraturnyh matèryâlaŭ XIX st*. Mìnsk: Belaruskaâ navuka [Кісялёў, Генадзь (укл.). (2003). *Пачынальнікі: З гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст*. Мінск: Беларуская навука].

Kìsâlëŭ, Genadz′. (2005). *Žylì-bylì klasìkì: Hto napìsaŭ paèmy èneìda navavarat ì taras na parnase*. Mìnsk: Belaruskaâ navuka [Кісялёў, Генадзь. (2005). *Жылі-былі класікі: Хто напісаў паэмы ЭНЕІДА НАВАВАРАТ і ТАРАС НА ПАРНАСЕ*. Мінск: Беларуская навука].

Kìsâlëŭ, Genadz′. (2007). Lìtaraturaznaŭstva ì lìtaraturnaâ krytyka Belarusì: ad vytokaŭ da pačatku XX st. U: Uladzìmìr Marhel′, Vâčaslaŭ Čamâryckì (red.). *Gìstoryâ belaruskaj lìtaratury XI–XIX stagoddzâŭ u dvuh tamah*. T. 2, *Novaâ lìtaratura: drugaâ*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/05/2026 09:24:37



*palova XVIII–XIX stagoddze*. Mìnsk: Belaruskaâ navuka. [Кісялёў, Генадзь. (2007). *Літаратуразнаўства і літаратурная крытыка Беларусі: ад вытокаў да пачатку XX ст*. У: Уладзімір Мархель, Вячаслаў Чамярыцкі (рэд.). *Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў у двух тамах*. Т. 2, *Новая літаратура: другая палова XVIII–XIX стагоддзе*. Мінск: Беларуская навука].

*Korespondencja „Słowa*”. (1859). *Słowo*, 7 (24.01/5.02).

Krzyżanowski, Julian. (1970). Dawne losy książki w okupowanej Warszawie. W: Lorentz, Stanisław (red.). *Walka o dobra kultury polskiej 1939–1945: Księga zbiorowa*. T. 1. Warszawa: Państwowy Instytut Wydawniczy.

Krzyżanowski, Julian. (1997). *Na polach elizejskich literatury polskiej. Portrety i wspomnienia*. Warszawa: Towarzystwo Literackie im. Adama Mickiewicza.

Kupala, Ânka (red.). (1940) *Belaruskaâ lìtaratura XIX stagoddzâ: Zbornìk tèkstaŭ*. Mìnsk: Vydavectva AN BSSR. [Купала, Янка (рэд.). (1940) *Беларуская літаратура XIX стагоддзя: Зборнік тэкстаў*. Мінск: Выдавецтва АН БССР].

Larčanka, Mìhas′; Fìgloŭskaâ, Lûboŭ. (1939). Novyâ matèryâly abbelaruskaj lìtaratury XIX stagoddzâ. *LìM*, 13 (9 sakavìka). [Ларчанка, Міхась; Фіглоўская, Любоў. (1939). Новыя матэрыялы аб беларускай літаратуры XIX стагоддзя. *ЛіМ*, 13 (9 сакавіка)].

Lojka, Aleg; Ragojša, Vâčaslaŭ (ukl.). (1988). *Belaruskaâ lìtaratura XIX stagoddzâ: Hrèstamatyâ*. Mìnsk: Vyšèjšaâ škola. [Лойка, Алег; Рагойша, Вячаслаў (укл.). (1988). *Беларуская літаратура XIX стагоддзя: Хрэстаматыя*. Мінск: Вышэйшая школа].

Mal′dzìs, Adam. (1962). Pìs′ma raskazvaûc′. *LìM*, 12 (9 lût.). [Мальдзіс, Адам. (1962). Пісьма расказваюць. *ЛіМ*, 12 (9 лют.)].

Mal′dzìs, Adam. (1969). *Padarožža ŭ XIX stagoddze. Z gìstoryì belaruskaj lìtaratury, mastactva ì kul'tury: navukova-papulârnyâ narysy.* Mìnsk: Narodnaâ asveta. [Мальдзіс, Адам. (1969). *Падарожжа ў XIX стагоддзе. З гісторыі беларускай літаратуры, мастацтва і культуры: навукова-папулярныя нарысы.* Мінск: Народная асвета].

Mal′dzìs, Adam. (1987). Anglìjskì dzënnìk. U: Adam Mal′dzìs. *Z lìtaraturaznaŭčyh vandravannâŭ: Narysy, èsè, dzënnìkì*. Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura. [Мальдзіс, Адам. (1987). Англійскі дзённік. У: Адам Мальдзіс. *З літаратуразнаўчых вандраванняў: Нарысы, эсэ, дзённікі*. Мінск: Мастацкая літаратура].

Marcìnkevìč, Geranìm. (1988). Advâčorak: Akazìâ ŭ karčme pad Fal′kovìčamì. U: Aleg Lojka; Vâčaslaŭ Ragojša (ukl.). *Belaruskaâ lìtaratura XIX stagoddzâ: Hrèstamatyâ*. Mìnsk: Vyšèjšaâ škola. [Марцінкевіч, Геранім. (1988). Адвячорак: Аказія ў карчме пад Фальковічамі. У: Алег Лойка, Вячаслаў Рагойша (укл.). *Беларуская літаратура XIX стагоддзя: Хрэстаматыя*. Мінск: Вышэйшая школа].

Marhel′, Uladzìmìr. (1997). Ščyry, ale ne kamerny. U: Uladzìmìr Marhel′. *Prysutnasc' byloga: Narysy, artykuly, èsè*. Mìnsk: Vydavec M. Trafìmčuk. [Мархель, Уладзімір. (1997). Шчыры, але не камерны. У: Уладзімір Мархель. *Прысутнасць былога: Нарысы, артыкулы, эсэ*. Мінск: Выдавец М. Трафімчук].

Pacûpa, Ûras′. (2019). Âščè adna ananìmnaâ paèma. *Dzeâsloŭ*, 5(102), s. 219–227. [Пацюпа, Юрась. (2019). *Яшчэ адна ананімная паэма*. *Дзеяслоў*, 5(102), с. 219–227].

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/05/2026 09:24:37



Piâtuhovìč, Mìhajla. (1990). Rukapìsy A. Rypìnskaga. U: Genadzʹ Kìsâlëŭ (ukl.). *Šlâham gadoй*: *Gìstoryka-lìtaraturny zbornìk*. Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura. [Піятуховіч, Міхайла. (1990). Рукапісы А. Рыпінскага. У: Генадзь Кісялёў (укл.). *Шляхам гадоў: Гісторыка-літаратурны зборнік*. Мінск: Мастацкая літаратура].

Pšyrkoŭ, Ûlʹân (red.). (1950). *Belaruskaâ lìtaratura XIX stagoddzâ: Zbornìk tèkstaй*. Mìnsk: Vydavectva AN BSSR. [Пшыркоў, Юльян (рэд.). (1950). *Беларуская літаратура XIX стагоддзя: Зборнік тэкстаў*. Мінск: Выдавецтва АН БССР].

Saroka, Svâtlana. (2001c). Prablemy razvìccâ belaruskaj movy ŭ XIX stagoddzì. U: Anatolʹ Verabej (red.). *Uladzìmìr Karatkevìč ì sučasnascʹ. Zbornìk artykulaй*. Navapolack: Vydavectva PDU. [Сарока, Святлана. (2001c). Праблемы развіцця беларускай мовы ў XIX стагоддзі. У: Анатоль Верабей (рэд.). *Уладзімір Караткевіч і сучаснасць. Зборнік артыкулаў*. Наваполацк: Выдавецтва ПДУ].

Semânovìč, Anton. (1961). *Belaruskaâ dramaturgìâ: Dakastryčnìckì peryâd*. Mìnsk: AN BSSR. [Семяновіч, Антон. (1961). *Беларуская драматургія: Дакастрычніцкі перыяд*. Мінск: АН БССР].

Skalaban, Vìtalʹ. (1988). Novyâ matèryâly z gìstoryì belaruskaj lìtaratury XIX stagoddzâ. U: Genadzʹ Kìsâlëŭ (ukl.). *Šlâham gadoй*: *Gìstoryka-lìtaraturny zbornìk*. Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura. [Скалабан, Віталь. (1988). Новыя матэрыялы з гісторыі беларускай літаратуры XIX стагоддзя. У: Генадзь Кісялёў (укл.). *Шляхам гадоў: Гісторыка-літаратурны зборнік*. Мінск: Мастацкая літаратура].

Skalʹkovskìj, A. (1845). *Naězdy gajdamak" na Zapadnuû Ukrainu v" XVIII stolětii. 1733–1768*. Odessa. [Скальковскій, А. (1845). *Наѣзды гайдамакъ на Западную Украину въ XVIII столѣтіи. 1733–1768*. Одесса].

Soroko, Svetlana. (2001a). *„Vitebskie gubernskie vedomosti" v sisteme belorusskoj dorevolûcionnoj pressy: Avtoreferat dissertacii na soiskanie učenoj stepeni kandidata filologičeskih nauk*. Minsk. [Сороко, Светлана. (2001a). *„Витебские губернские ведомости" в системе белорусской дореволюционной прессы: Автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата филологических наук*. Минск].

Soroko, Svetlana. (2001b). Ksenofont Govorskij v „Vitebskih gubernskih vedomostâh". W: *Problemy istorii literatury*: *Sbornik statej*, 13. Moskva: MGOPU. [Сороко, Светлана. (2001b). Ксенофонт Говорский в „Витебских губернских ведомостях". В: *Проблемы истории литературы: Сборник статей*, 13. Москва: МГОПУ].

Soroko, Svetlana. (2001d). Paradoksy Vitebskoj gubernii. W: *Problemy istorii literatury: Sbornik statej*, 14. Moskva: MGOPU. [Сороко, Светлана. (2001d). Парадоксы Витебской губернии. В: *Проблемы истории литературы: Сборник статей*, 14. Москва: МГОПУ].

Šunkevič", A. (1889). Scâpan i Tacâna: Iz" Bělorusskoj žizni. *Minskij listok*, 18 (7 marta). [Шункевичъ, А. (1889). Сцяпан и Тацяна: Изъ Бѣлорусской жизни. *Минскій листокъ*, 18 (7 марта)].

Vasìleŭskì, Danìla. (1929). Poèma taras na parnase ŭ kraâznaŭčymasʹvâtlenʹnì. *Naš Kraj*, 5. [Васілеўскі, Даніла. (1929). Поэма тарас на парнасе ў краязнаўчым асьвятленьні. *Наш Край*, 5].

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 30/05/2026 09:24:37



Zelenin″, Dmitrìj. (1914). *Opisanie rukopisej Učenago arhiva Imperatorskago russkago geografičeskago obŝestva*. Vyp. 1. Petrograd. [Зеленинъ, Дмитрій. (1914). *Описаніе рукописей Ученаго архива Императорскаго русскаго географическаго общества*. Вып. 1. Петроградъ].

SUBMITTED: 10.11.2020
ACCEPTED: 8.01.2021
PUBLISHED ONLINE: 12.12.2021

## ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

**Mikałaj Chaustowicz / Мікола Хаўстовіч** – Polska, Uniwersytet Warszawski, Katedra Białorutenistyki; dr hab., prof.; specjalność naukowa: literaturoznawstwo białoruskie; zainteresowania naukowe: literatura białoruska w XIX wieku.

Adres: Katedra Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego, ul. Szturmowa 4, 02-678 Warszawa, Polska

Wybrane publikacje:

1. Хаўстовіч, Мікола. (2014–2020). *Даследаванні і матэрыялы: Літаратура Беларусі XIX – пачатку XX стагоддзяў*. Т. 1–6. Warszawa: Katedra Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego.
2. Хаўстовіч, Мікола. (2010). *Шляхамі да беларускасці: Нарысы, артыкулы, эсэ*. Warszawa: Katedra Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego.
3. Хаўстовіч, Мікола. (2006). *Айчына здалёку і зблізку: Ігнацы Яцкоўскі і Аляксандар Рыпінскі*. Мінск: Права і эканоміка.
4. Хаўстовіч, Мікола. (2003). *Мастацкі метад Яна Баршчэўскага*. Мінск: БДУ.
5. Хаўстовіч, Мікола. (2001). *Гісторыя беларускай літаратуры 30–40-х гг. XIX ст*. Мінск: БДУ.